# Умовы конкурсу
# «Грамадзянская супольнасць для развіцця Беларусі»
# на перыяд з 2 жніўня па 24 верасня 2023 г.

Дата публікацыі: 2 жніўня 2023 г.

## ЗМЕСТ


1. Агульныя палажэнні конкурсу грантаў ....................1
2. Прыярытэты конкурсу ....................2
3. Патрабаванні да заяўнікаў ....................3
4. Умовы фінансавання ....................4
5. Працэдура падачы праектных прапаноў ....................6
6. Ацэнка і адбор праектных прапаноў ....................7
7. Дадатковая інфармацыя і пытанні ....................8


## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ КОНКУРСУ ГРАНТАЎ

1.1. Конкурс праводзіцца з агульнай мэтай **узмацнення грамадзянскай супольнасці Беларусі праз стварэнне (узнаўленне) і падтрыманне ў грамадстве камунікацыйных каналаў і інстытутаў, якія спрыяюць дэмакратычным каштоўнасцям**.

1.2. Бюджэт праектаў, пададзеных на гранты, можа складаць **ад *8.000*[1] да 30.000 еўра**.

1.3. Працягласць праектаў можа складаць да **7 месяцаў**, у залежнасці ад даты пачатку рэалізацыі праекта (гл. больш падрабязна ў п. 5.3.).

1.4. У межах конкурсу будуць падтрыманы толькі тыя праектныя прапановы, якія адпавядаюць агульнай мэце і аднаму або некалькім прыярытэтам і пададзены ў адпаведнасці з патрабаваннямі конкурсу.

1.5. Арганізацыя/ініцыятыва можа падаць заяўку на грант самастойна або з адным ці некалькімі партнёрамі (сузаяўнікамі). Арганізацыя/ініцыятыва можа адначасова (у рамках аднаго набору заявак) падаць толькі адну праектную прапанову на конкурс у якасці асноўнага заяўніка. Пры гэтым

[1] Тут і надалей курсівам адзначаны істотныя змены, якія былі унесеныя ў правілы конкурсу, у параўнанні з правіламі конкурсу на перыяд з 7 лютага па 30 красавіка 2023 года.

заяўнік можа быць партнёрам у некалькіх праектах, пададзеных на конкурс у межах аднаго набору заявак.

1.6. У выпадку, калі заяўнік ужо выконвае праект, які быў раней падтрыманы праграмай, гэтая арганізацыя/ініцыятыва можа падаць новую заяўку на конкурс. У выпадку падтрымкі такой заяўкі ацэначная камісія вырашае: можа праект пачацца з запланаванай даты ці толькі пасля паспяховага завяршэння папярэдняга праекта (альбо нейкай яго часткі).

1.7. У выпадку падпісання грантавага пагаднення ў рамках дадзенага конкурсу асноўны заяўнік праекта будзе выступаць у якасці грантаатрымальніка і каардынатара праекта, прадстаўляць сваіх сузаяўнікаў і дзейнічаць ад іх імя, а таксама каардынаваць распрацоўку і рэалізацыю праекта.

## 2. ПРЫЯРЫТЭТЫ КОНКУРСУ

2.1. У межах гэтага конкурсу могуць быць **падтрыманы праекты па адным або некалькіх прыярытэтах**:

- Развіццё патэнцыялу беларускіх АГС; стварэнне і развіццё кааліцый, супрацоўніцтва і партнёрства паміж структурамі і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці, у тым ліку развіццё інфраструктуры бізнес-асацыяцый, клубаў і іншых бізнес-супольнасцяў у Беларусі і за мяжой, якія абараняюць інтарэсы беларускага бізнесу.
- Развіццё грамадзянскіх кампетэнцый і спрыянне грамадзянскаму ўдзелу беларусаў, якія знаходзяцца ў Беларусі і за мяжой, і міратворчасці;
- Прасоўванне каштоўнасцяў правоў чалавека, інклюзіі, гендарнай роўнасці, экапрыязнасці, добрага кіравання (good governance) у беларускім грамадстве.

2.2. Праекты могуць уключаць кампанент (але не цалкам складацца з) дзейнасці, накіраванай на ўзмацненне арганізацыйнага патэнцыялу заяўніка для больш эфектыўнай працы і ажыццяўлення сваёй місіі. Выдаткі на такую дзейнасць могуць складаць не больш за 40% запытанага бюджэту.

2.3. Вітаюцца праекты, распрацаваныя моладзевымі арганізацыямі і ініцыятывамі для маладых людзей.

2.4. Праекты могуць уключаць толькі мірную грамадзянскую дзейнасць.

2.5. Недапушчальнымі ў гэтым конкурсе з'яўляюцца наступныя віды дзейнасці:

- дзейнасць, звязаная толькі ці пераважна з фінансавай падтрымкай удзелу пэўных асоб у працоўных сустрэчах, семінарах, канферэнцыях і кангрэсах;
- дзейнасць, звязаная толькі ці пераважна з выдачай індывідуальных стыпендый для навучання ці ўдзелу ў адукацыйных курсах;
- дзейнасць, якая выяўляецца ў капітальных укладаннях, напрыклад, у набыцці зямлі, будынкаў, абсталявання і транспартных сродкаў;
- дзейнасць, якая дыскрымінуе пэўных асоб ці групы людзей па прыкмеце полу, сексуальнай арыентацыі, рэлігійных перакананняў ці адсутнасці такіх, альбо па іх этнічным паходжанні;
- дзейнасць, што ўтрымлівае заклікі да гвалту;
- дзейнасць, накіраваная на падтрымку палітычных партый.

## 3. ПАТРАБАВАННІ ДА ЗАЯЎНІКАЎ

3.1. Падаць заяўку на конкурс могуць:

3.1.1. **беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці** — некамерцыйныя самакіраваныя арганізацыі, якія аб'ядноўваюць людзей па прынцыпе добраахвотнасці і не асацыяваныя з дзяржавай:

- зарэгістраваныя грамадскія аб'яднанні, фонды, асацыяцыі (саюзы) юрыдычных асоб, некамерцыйныя ўстановы;
- ініцыятыўныя групы грамадзян;
- грамадскія арганізацыі, зарэгістраваныя за мяжой, якія вядуць дзейнасць для дэмакратычнага развіцця Беларусі;
- незалежныя прафсаюзныя арганізацыі;
- бізнес-асацыяцыі, клубы і іншыя бізнес-супольнасці.

3.1.2. **рэдакцыі беларускіх незалежных СМІ і медыя-рэсурсы** (уключаючы *ініцыятыўныя групы* блогераў).

3.1.3. **беларускія камерцыйныя недзяржаўныя арганізацыі**, зарэгістраваныя як у Беларусі, так і за мяжой.

3.2. *Індывідуальныя заяўнікі (напрыклад, актывісты, індывідуальныя прадпрымальнікі, індывідуальныя блогеры і да т.п)* ***не могуць*** *падаваць заяўкі ў межах дадзенага конкурсу*.

3.3. **Партнёрамі** заяўнікаў па праекце могуць быць арганізацыі і ініцыятыўныя групы з любым юрыдычным статусам, некамерцыйныя і камерцыйныя арганізацыі.

3.4. Заяўнікі будуць выдалены з удзелу ў конкурсе ў выпадку, калі:

- яны не адпавядаюць вышэйпазначаным патрабаванням;
- яны і/ці іх паўнамоцныя прадстаўнікі не выконваюць прынцып пазбягання канфлікту інтарэсаў;
- існуюць факты здзяйснення імі парушэнняў у рэалізацыі і адміністраванні грантавых праектаў (атрыманне падвойнага фінансавання або іншыя сур'ёзныя парушэнні);
- іх прадстаўнікі *і/ці звязаныя з імі арганізацыі і асобы* знаходзяцца ў санкцыйных спісах Еўрапейскага Саюза і краін-сябраў ЕС.

3.5. Органы дзяржаўнай улады, дзяржаўныя арганізацыі, *арганізацыі, асацыяваныя з дзяржавай*, а таксама палітычныя арганізацыі, рухі і партыі **не могуць** падаваць праектныя прапановы і быць партнёрамі па праектах у межах дадзенага конкурсу.

## 4. УМОВЫ ФІНАНСАВАННЯ

*4.1. Сродкі гранта могуць быць пераведзены толькі на банкаўскі рахунак арганізацыі, зарэгістраванай за межамі Беларусі. Арганізацыя-атрымальніца сродкаў павінна быць заяўніцай ці партнёркай праекта.*

4.2. Прымальнымі лічацца фактычныя выдаткі, якія панясуць асноўны заяўнік і яго сузаяўнікі (калі такія ёсць) у ходзе выканання праекта. Напрыклад, заработная плата пастаяннага персаналу праекта, ганарары часовага персаналу і экспертаў, выдаткі на праектны офіс і камунікацыю, выдаткі на праезд, харчаванне і пражыванне, іншыя выдаткі на праектную дзейнасць (тавары, паслугі), неабходныя для рэалізацыі праекта, за выключэннем выдаткаў, пералічаных у артыкуле 4.4. ніжэй. Усе выдаткі, запытаныя ў праектнай прапанове, павінны быць апраўданымі, абгрунтаванымі і адпавядаць патрабаванням рацыянальнага фінансавага менеджменту, у прыватнасці, у дачыненні да эканоміі і эфектыўнасці.

4.3. Бюджэт праекта павінен уключаць у сябе аплату ўсіх неабходных падаткаў, адлічэнняў, унёскаў і банкаўскіх выдаткаў, звязаных з пераводам сродкаў і ажыццяўленнем фінансавых аперацый па праекце.

4.4. Сродкі, якія запытваюцца на рэалізацыю праектаў, не могуць выкарыстоўвацца для:

- ажыццяўлення дзейнасці, не апісанай у праектнай заяўцы;
- куплі нерухомасці (будынкаў або зямельных участкаў);
- *куплі абсталявання, тэхнікі ці мэблі;*
- вядзення дзейнасці, накіраванай на атрыманне прыбытку;
- аплаты працы (заработнай платы) дзяржаўных служачых;
- кампенсацыі запазычанасцяў (штрафаў, даўгоў, крэдытаў і іншых абавязанняў) і выдаткаў па іх абслугоўванне (працэнтаў);
- кампенсацыі стратаў ад курсавых розніц;
- фармавання рэзерваў на пакрыццё стратаў, запазычанасцяў або патэнцыйных абавязанняў у будучыні;
- выдавання крэдыту (субсідый і інш.) трэцім асобам.

4.5. У межах конкурсу можа запытвацца суфінансаванне іншых праектаў, якія адпавядаюць мэце і прыярытэтам конкурсу.

4.6. Для рэалізацыі праекта па падтрыманай заяўцы з грантаатрымальнікам будзе падпісана пагадненне аб мэтавым фінансаванні, што прадугледжвае прадастаўленне апісальнай і фінансавай справаздачнасці аб рэалізуемым праекце па формах праграмы. Справаздачнасць павінна суправаджацца дакументацыяй, якая пацвярджае выдаткі па праекце і дасягненне вынікаў.

4.7. У выпадку, калі сума гранта не перавышае 14.500 еўра, са згоды асноўных донараў праграмы і па рашэнні ацэначнай камісіі грантаатрымальніку можа быць прапанавана дамова аб дасягненні канкрэтных вынікаў (англ. output-based contract), якая прадугледжвае прадастаўленне толькі апісальных справаздач і пацвярджэнне дасягнення вынікаў.

4.8. 90% ад агульнай сумы гранта будзе пералічана авансам адным ці некалькімі плацяжамі згодна з пазначаным у грантавым пагадненні графікам плацяжоў, прывязаным да графіка дзейнасці і прадастаўлення справаздач. Апошні плацёж у памеры да 10% ад агульнай сумы бюджэту будзе пераведзены грантаатрымальніку толькі пасля зацвярджэння фінальнай справаздачы (гэта значыць, што грантаатрымальнік на працягу выканання праекта павінен будзе аплаціць да 10% праектных выдаткаў з уласных сродкаў, якія будуць кампенсаваны грантадаўцам толькі ў выпадку зацвярджэння фінальнай справаздачы).

4.9. *У выключных выпадках, па ўзгадненні з асноўнымі донарамі праграмы, грантаатрымальніку можа быць прапанавана выкананне праекта з умовай правядзення аплаты паслуг і тавараў, неабходных для выканання праекта, непасрэдна з рахунка грантадаўцы. У такіх выпадках схема аплаты выдаткаў, апісаная ў п. 4.8, не будзе ўжывацца. Грантаатрымальнік павінен будзе падаваць апісальныя справаздачы і пацверджанне дасягнення вынікаў праекта.*

## 5. ПРАЦЭДУРА ПАДАЧЫ ПРАЕКТНЫХ ПРАПАНОЎ

5.1. Праектная прапанова ўключае заяўку на грант і бюджэт праекта, запоўненыя на рускай ці беларускай мове. Пакет заяўкі таксама ўключае падпісаную дэкларацыю заяўніка і, калі можна ўжыць, падпісаны мандат партнёра(-аў). У рамках конкурсу будуць разгледжаны толькі тыя праектныя прапановы, якія былі складзены з выкарыстаннем **формы заяўкі і бюджэту** гэтага конкурсу.

5.2. Заяўкі прымаюцца на электронны адрас **cs4b@protonmail.com** з адрасу электроннай пошты, зарэгістраванага на сервісе ProtonMail. Калі на вашым камп'ютары не адкрываецца сайт ProtonMail, просім вас выкарыстаць сэрвіс VPN.

5.3. Заяўкі прымаюцца і будуць разглядацца ацэначнай камісіяй згодна з наступным графікам:

| **Апошні тэрмін падачы заяўкі** | **Меркаваная дата абвяшчэння рашэння ацэначнай камісіі** | **Меркаваная дата пачатку выканання праектаў** | **Максімальная працягласць праектаў** |
|---|---|---|---|
| Набор 1:<br>да 23:59 (па Мінску)<br>***20.08.2023*** | *да 18.09.2023* | *Не раней за 01.10.2023*<br>*Не пазней за 01.11.2023* | *Да 7 месяцаў* |
| Набор 2:<br>*да 23:59 (па Мінску)*<br>***24.09.2023*** | *да 23.10.2023* | *Не раней за 01.01.2024* | *Да 4 месяцаў* |

5.4. Усе праекты, падтрыманыя ў межах двух набораў гэтага конкурсу, павінны завяршыцца да **1 мая 2024 года**.

5.5. Гэты конкурс завяршаецца пасля заканчэння 2-га набору — 24 верасня 2023 года.

## 6. АЦЭНКА І АДБОР ПРАЕКТНЫХ ПРАПАНОЎ

6.1. Для ацэнкі праектных прапаноў, якія адпавядаюць пералічаным вышэй патрабаванням, ацэначная камісія выкарыстоўвае наступныя крытэрыі:

| Крытэрыі | Максімальны бал |
|---|---|
| **1. Рэлевантнасць праекта** | |
| 1.1. Наколькі праектная прапанова адпавядае мэце конкурсу? Ці адпавядаюць чаканыя вынікі праектнай прапановы прыярытэтам, выкладзеным ва ўмовах конкурсу? | 5 |
| 1.2. Наколькі дакладна вызначаны і наколькі стратэгічна абгрунтаваны выбар ахопленых праектам груп (канчатковыя атрымальнікі карысці, мэтавыя групы)? Ці дакладна вызначаны іх актуальныя патрэбы і праблемы, і ці ўлічваюцца яны ў праектнай прапанове належным чынам? | 10 |
| **2. Дызайн праекта** | |
| 2.1. Наколькі лагічным з'яўляецца праект? Ці з'яўляецца прапанаваная дзейнасць неабходнай, выканальнай, і ці забяспечвае яна атрыманне меркаваных прадуктаў (outputs) і змен (outcomes)? | 10 |
| 2.2. Ці з'яўляюцца вынікі дасяжнымі і вымернымі? | 5 |
| 2.3. Ці вядзе атрыманне запланаваных прадуктаў праекта (outputs) да дасягнення чаканых змен? | 5 |
| **3. Падыход да рэалізацыі праекта** | |
| 3.1. Наколькі зразумелы і выканальны план дзеянняў і тэрміны рэалізацыі праекта? | 5 |
| **4. Устойлівасць праекта** | |
| 4.1. Ці паўплывае істотна дзейнасць на мэтавыя групы? | 5 |
| 4.2. Ці ўстойлівыя чаканыя вынікі прапанаванага праекта? | 5 |
| **5. Бюджэт і эканамічная мэтазгоднасць праекта** | |
| 5.1. Ці адлюстраваны мерапрыемствы праекта ў бюджэце належным чынам? | 10 |
| 5.2. Ці з'яўляюцца здавальняючымі суадносіны меркаваных выдаткаў і вынікаў праекта? | 10 |
| **6. Патэнцыял заяўніка для рэалізацыі праекта** | |
| 6.1. Ці валодае заяўнік дастатковым досведам кіравання праектамі? | 5 |
| **7. Дадатковая каштоўнасць праекта** | |
| 7.1. Ці прадугледжвае праект якія-небудзь дадатковыя перавагі (напр., скразныя каштоўнасці, падыход, заснаваны на правах чалавека, праца з маладымі людзьмі, значны ўдзел партнёра(-аў), інавацыйная дзейнасць і лепшыя практыкі і г.д.)? | 5 |
| **РАЗАМ** | **80** |

6.2. *Плануецца, што ў межах кожнага набору будзе падтрымана па 10-15 заявак (у залежнасці ад якасці пададзеных заявак і іх бюджэту).*

6.3. Па выніках разгляду заявак ацэначнай камісіяй конкурсу папярэдне зацверджаныя праекты могуць быць адпраўленыя на дапрацоўку. Канчатковае рашэнне аб падтрымцы такога праекту будзе прынятае пасля ўнясення заяўнікам адпаведных змен у заяўку або бюджэт праекта.

6.4. Рашэнне аб падтрымцы любога праекта, пададзенага на конкурс, носіць папярэдні характар аж да падпісання грантавага пагаднення з заяўнікам. Фінальнае рашэнне залежыць ад своечасовай камунікацыі з боку заяўніка, падачы па просьбе грантадаўцы ўсёй інфармацыі, неабходнай для падпісання пагаднення аб фінансаванні, ад паўнаты і дакладнасці такой інфармацыі, *а таксама ад вынікаў узгаднення спісу атрымальнікаў падтрымкі з асноўнымі донарамі*. Калі заяўнік не будзе своечасова і поўна прадастаўляць інфармацыю і адказваць на пытанні грантадаўцы без папярэдняга паведамлення або прадаставіць няпоўную або недакладную інфармацыю, рашэнне аб падтрымцы праекта можа быць скасавана на гэтай падставе, а сродкі выкарыстаны для падтрымкі праекта, які набраў меншую колькасць балаў.

## 7. ДАДАТКОВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ І ПЫТАННІ

7.1. З дадатковай інфармацыяй пра конкурс, з формамі заявак, адукацыйнымі матэрыяламі і адказамі на пытанні, якія часта задаюць, можна азнаёміцца на сайце www.cs4b.info.

7.2. Пытанні, што датычаць умоў конкурсу і падачы праектных прапаноў, можна накіроўваць у тэлеграм-акаўнт @CSforB, на электронную пошту cs4b@protonmail.com і праз форму на сайце www.cs4b.info. Арганізатары конкурсу будуць адказваць на пытанні па працоўных днях з 10:00 да 18:00 па беларускім часе.